# Тлехуч Вольга Кузьмінічна



Тлехуч Вольга Кузьмінічна нарадзілася 10 ліпеня 1915 года ў в.Старое Сяло Ушацкага раена. Дзяўчына скончыла школу ў Ушачах, пасля Полацкае педагагічнае вучылішча. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працавала настаўнікам пачатковых класаў. Яшчэ да вайны паспела скончыць настаўніцкі інстытут, які ў той час даваў няпоўную вышэйшую адукацыю, набыла кваліфікацыю выкладчыка беларускай мовы і літаратурнага чытання.

Да вайны Вольга Кузьмінічна выйшла замуж за Кулакова Івана Аляксандравіча. У час вайны ён быў падпольшчыкам. Фашысты схапілі яго, катавалі і закапалі жывым.

Геройская смерць мужа толькі загартавала волю маладой жанчыны, Вольга цверда вырашыла дапамагаць партызанам. З 4 чэрвеня 1942 года па 7 ліпеня 1944 года яна была партызанскай сувязной брыгады Дубава.

Пасля вайны ў 1945-1946 навучальным годзе Вольга Кузьмінічна працавала дырэктарам Падсвільскай сярэдняй школы. Тут яна знаёміцца з былым лётчыкам, а зараз настаўнікам фізічнай культуры Тлехучам Салехам Гісавічам, які ў хуткім часе становіцца яе мужам.

У 1948 годзе сям'ю накіроўваюць на працу ў Загацьеўскую сямігодку, дзе Вольга Кузьмінічна працуе спачатку завучам, а потым і дырэктарам. Муж выкладаў гісторыю, геаграфію і фізічную культуру.

У 1954 годзе сям'я Тлехучаў перабіраецца ў в.Зябкі, будуе дом, трымае гаспадарку. Вольга Кузьмінічна працуе завучам, Салех Гісавіч – настаўнікам гісторыі і геаграфіі. Сям'я адрознівалась сваёй інтэлегентнасцю, высокай культурай, сціпласцю ў быце.